2024

CSO FUSION

БАНК ІДЭЙ

Funded by the European Union




# ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

# ЗМЕСТ:

ПРАДМОВА ........ 3
МЕТАДАЛОГІЯ АЦЭНКІ ІНДЭКСА ЎСТОЙЛІВАСЦІ АГС ........ 4
АГУЛЬНАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ АГС ........ 6
ПРАВАВОЕ АСЯРОДДЗЕ ........ 8
АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ........ 11
ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ ........ 13
АДВАКАТАВАННЕ ........ 16
АКАЗАННЕ ПАСЛУГ ........ 19
ІНФРАСТРУКТУРА СЕКТАРА ........ 21
ГРАМАДСКІ ІМІДЖ ........ 24

*Дадзеная справаздача падрыхтавана ў межах адкрытага конкурсу Банка Ідэй для знешніх даследчыкаў і даследчыц. Гэты праект фінансуецца Еўрапейскім Саюзам*

***Фота на вокладцы:***
*Belarus Future Unconference 23 лістапада 2024 года, Цэнтр новых ідэй*

# ПРАДМОВА

**Арганізацыя CSO Fusion з гонарам прадстаўляе 25-е выданне Індэкса ўстойлівасці беларускіх арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГС), у якім адлюстраваны ключавыя тэндэнцыі і змены ў сектары за 2024 год.**

**Гэта выданне — сведчанне сілы, стойкасці і салідарнасці беларускіх грамадскіх арганізацый, ініцыятыў і актывістаў. Нягледзячы на беспрэцэдэнтныя рэпрэсіі, вымушаную эміграцыю і няўпэўненасць у будучыні, АГС працягваюць працаваць на карысць суверэннай, дэмакратычнай і паспяховай Беларусі.**

Індэкс устойлівасці АГС (Civil Society Organization Sustainability Index, CSOSI) — гэта аналітычны інструмент, распрацаваны Агенцтвам Злучаных Штатаў Амерыкі па міжнародным развіцці (USAID) у 1998 годзе дзеля ацэнкі ўзроўню развіцця арганізацый грамадзянскай супольнасці. У папярэднія гады Індэкс каардынавана ацэньваў устойлівасць АГС больш чым у 70 краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, Еўразіі, Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі. З 2023 года метадалогія Індэкса самастойна выкарыстоўваецца асобнымі краінамі, у тым ліку — Беларуссю.

Ацэнка ўстойлівасці беларускіх АГС упершыню адбылася ў 2000 годзе і з таго часу працягваецца штогод. З 2008 года і да ліквідацыі ў 2022-м яе выконвала Міжнароднае асветніцкае грамадскае аб'яднанне «АКТ», цяпер працу над Індэксам працягвае арганізацыя CSO Fusion.

Сёння беларуская грамадзянская супольнасць існуе транстэрытарыяльна — у Мінску і Бабруйску, у Варшаве і Вільні, у Берліне і Тбілісі — усюды, дзе беларусы аб'ядноўваюцца дзеля пазітыўных перамен. Таму Індэкс ацэньвае ўстойлівасць беларускіх АГС незалежна ад іх фактычнага месцазнаходжання.

Для краіны, дзе доступ да надзейнай інфармацыі абмежаваны, Індэкс застаецца адным з нямногіх сістэмных інструментаў, што дазваляюць зразумець, як беларускія АГС дзейнічаюць, развіваюцца і трансфармуюцца ў доўгатэрміновай перспектыве.

Ацэнка і публікацыя справаздач па Індэксу ўстойлівасці АГС былі б немагчымымі без удзелу шматлікіх асоб і арганізацый. Мы асабліва ўдзячныя ўдзельнікам экспертнай групы і аўтарам справаздачы, якія падзяліліся сваімі ўнікальнымі ведамі, аналітычнымі высновамі і экспертызай, што сталі асновай гэтага Індэкса.

*Прыемнага чытання!*

# МЕТАДАЛОГІЯ АЦЭНКІ ІНДЭКСА ЎСТОЙЛІВАСЦІ АГС

Індэкс устойлівасці АГС збірае і сістэматызуе ключавую інфармацыю для арганізацый грамадзянскай супольнасці, урадаў, даследчыкаў, донараў і іншых асоб, дапамагаючы ім лепш разумець умовы, у якіх працуе сектар АГС, яго эфектыўнасць і жыццяздольнасць.

Індэкс адсочвае паляпшэнні і зніжэнні паказчыкаў па сямі параметрах устойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці:

1. **Прававое асяроддзе** — прававыя і нарматыўныя ўмовы для дзейнасці АГС;
2. **Арганізацыйны патэнцыял** — унутраны патэнцыял сектара АГС для дасягнення сваіх мэтаў;
3. **Фінансавая ўстойлівасць** — доступ сектара АГС да розных крыніц фінансавай падтрымкі;
4. **Адвакатаванне** — здольнасць АГС уплываць на грамадскую думку, дзяржаўную і карпаратыўную палітыкі;
5. **Аказанне паслуг** — здольнасць сектара АГС прадастаўляць тавары і паслугі;
6. **Інфраструктура сектара** — паслугі падтрымкі АГС, даступныя для сектара;
7. **Грамадскі імідж** — успрыманне сектара АГС грамадствам.

Кожнаму з параметраў адпавядае шэраг кампанентаў ацэнкі.

Як **арганізацыі грамадзянскай супольнасці** разглядаюцца любыя зарэгістраваныя або незарэгістраваныя арганізацыі, якія:

- не з’яўляюцца часткай дзяржаўнага апарата;
- не пераразмяркоўваюць прыбытак паміж сваімі кіраўнікамі, сябрамі і супрацоўнікамі;
- з’яўляюцца самакіраванымі;
- аб’ядноўваюць людзей і арганізацыі вакол агульнага інтарэса паводле прынцыпу добраахвотнасці.

З улікам транснацыянальнага характару беларускай грамадзянскай супольнасці пасля 2020 года, Індэкс ацэньвае ўстойлівасць беларускіх АГС незалежна ад іх бягучага месцазнаходжання. Пад беларускімі АГС, калі яны працуюць за межамі краіны, разумеюцца арганізацыі і ініцыятыўныя групы, якія па сваім паходжанні, складзе, мэтах або ідэнтычнасці захоўваюць устойлівую сувязь з Беларуссю і беларускім грамадствам. У прыватнасці:

- місія, мэты і фокус уплыву АГС накіраваны на паляпшэнне сітуацыі ў Беларусі і падтрымку беларускага грамадства;

- большасць залучаных асоб захоўваюць грамадзянскую, культурную або прафесійную сувязь з Беларуссю;
- АГС свядома ідэнтыфікуе сябе як частку беларускай грамадзянскай супольнасці, падкрэслівае сувязь з Беларуссю ў сваёй публічнай камунікацыі.

Метадалогія Індэкса ўстойлівасці АГС абапіраецца на дадзеныя, якія прадастаўляюцца практыкамі і даследчыкамі АГС, што ўваходзяць у экспертную групу для ацэнкі згаданых параметраў устойлівасці. Для ацэньвання выкарыстоўваецца сямібальная шкала, дзе 7 адпавядае самому нізкаму ўзроўню ўстойлівасці, а 1 — самому высокаму. Агульны паказчык устойлівасці для сектара АГС выводзіцца шляхам усярэднення балаў па параметрах.

Узроўні ўстойлівасці аб’яднаны ў тры асноўныя стадыі развіцця:

| Устойлівасць высокая | Устойлівасць нестабільная | Устойлівасць нізкая |
|---|---|---|
| **1.0 – 3.0** | **3.1 – 5.0** | **5.1 – 7.0** |

Пасля пасяджэння экспертнай групы рыхтуецца апісальная справаздача, якая падмацоўвае ацэнкі фактамі, падзеямі, прыкладамі і экспертнымі сведчаннямі.

Запрашаем азнаёміцца са справаздачамі па ацэнцы Індэкса ўстойлівасці АГС па Беларусі і іншых краінах за папярэднія гады на сайтах *CSO Fusion* і *CSOSI.org*.

# АГУЛЬНАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ АГС:

# 6.1 (2023: 6.0)




**У 2024 годзе ўстойлівасць сектара беларускіх арганізацый грамадзянскай супольнасці знізілася да 6.1 бала.** Прастора для іх дзейнасці працягвала звужацца, абмяжоўваліся магчымасці для сістэмнага развіцця і сувязяў з грамадскасцю, скарачаліся фінансавыя і чалавечыя рэсурсы, узрастала роля лаяльных уладам структур. На ўмовы дзейнасці АГС уплывала таксама міжнародная ізаляцыя Беларусі і аднабаковая палітыка ў сферы міжнароднага супрацоўніцтва. Сектар беларускіх АГС працягваў дзейнічаць як унутры краіны, так і за яе межамі, пры гэтым арыентуючы сваю дзейнасць на беларускае грамадства.

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі заставалася ў крытычным стане. На канец снежня 2024 года ў месцах зняволення знаходзіліся 1 265 палітычных вязняў. Хаця на працягу года па памілаванні былі вызвалены 227 чалавек, адначасова статус палітвязня быў прысвоены яшчэ 589 асобам. Агулам з лета 2020 года праваабарончай супольнасцю прызнаны палітзняволенымі 3 697 чалавек.

Паводле Праваабарончага цэнтра «Вясна», з рознымі формамі рэпрэсій — ад допытаў, затрыманняў, вобыскаў да крымінальнага пераследу — у 2024 годзе сутыкнуліся не менш за 8 895 чалавек. Узмацніўся ціск на журналістаў, супрацоўнікаў СМІ і блогераў, а рэпрэсіі ў дачыненні да ЛГБТК+ супольнасці набылі беспрэцэдэнтны характар як на ўзроўні заканадаўчых зменаў, так і праз пераслед канкрэтных асоб.

Не спыняліся маштабныя рэпрэсіі ў дачыненні да АГС і актывістаў. Больш за сто прадстаўнікоў АГС знаходзіліся ў месцах пазбаўлення волі. Пастаянна фіксаваліся факты затрыманняў, выклікаў на допыты, узбуджэння новых адміністрацыйных і крымінальных спраў. Гэтыя працэсы інтэнсіфікаваліся ў пачатку 2024 года на фоне выбараў у Палату прадстаўнікоў, мясцовыя Саветы дэпутатаў і на Усебеларускі народны сход, а таксама ў канцы года — напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у студзені 2025 г.

Працягвалася кампанія па ліквідацыі зарэгістраваных у Беларусі АГС. Паводле маніторынгу Lawtrend, у перыяд з 2020 па 2024 год не менш за 1 186 арганізацый былі прымусова ліквідаваны, яшчэ мінімум 705 прынялі рашэнне аб самаліквідацыі.

Незалежныя АГС, якія працягвалі дзейнічаць у краіне, асабліва незарэгістраваныя, пераважна пазбягалі шырокай публічнасці або працавалі ў падпольным фармаце. Нягледзячы на значна меншыя рызыкі прамога фізічнага пераследу, АГС у выгнанні і дыяспаральныя ініцыятывы часта абвяшчаліся «экстрэмісцкімі» і сутыкаліся з транснацыянальнымі формамі рэпрэсій, а таксама мелі справу з фінансавымі цяжкасцямі, выгараннем, недахопам прафесійных кадраў і пагаршэннем свайго іміджу.

У той жа час беларускія ўлады падтрымлівалі і развівалі лаяльныя дзяржаве арганізацыі, праводзілі конкурсы фінансавання грамадзянскіх ініцыятыў, якія адпавядалі іх прыярытэтам, і імкнуліся прыцягнуць АГС да трансляцыі дзяржаўнай ідэалогіі. У выніку арганізацыі, якія захавалі юрыдычны статус, часта аказваліся ўцягнутымі ў кааптацыю з дзяржавай, былі вымушаны дэманстраваць лаяльнасць і засяроджвацца на палітычна нейтральных тэмах. У гэтым кантэксце межы паміж АГС і ГОНГА станавіліся вельмі расплывістымі.

Па звестках Lawtrend, на 15 лістапада 2024 года ў Беларусі было зарэгістравана каля 2 123 АГС трох арганізацыйна-прававых форм: грамадскія аб'яднанні (1 533), фонды (119) і недзяржаўныя ўстановы (471). Пры гэтым колькасць новых арганізацый была не менш як у дзесяць разоў ніжэйшая за колькасць ліквідаваных. Большасць існуючых арганізацый дзейнічалі ў сферах спорту, дабрачыннасці, сацыяльнай дапамогі, аховы здароўя і адукацыі.

Хаця ўстойлівасць беларускіх АГС змяншаецца, яны, нягледзячы на рэпрэсіі і нявызначанасць будучыні, працягваюць адаптавацца да зменлівага асяроддзя, прафесійна развівацца і супрацьстаяць ціску, захоўваючы патэнцыял для доўгатэрміновых зменаў.

# ПРАВАВОЕ АСЯРОДДЗЕ: 7.0 (2023: 7.0)




У 2024 годзе сітуацыя з прававым асяроддзем для арганізацый грамадзянскай супольнасці перажыла шэраг змяненняў. Перш за ўсё яны закранулі заканадаўства, што рэгулюе дзейнасць АГС у Беларусі; некаторыя з гэтых зменаў насілі хоць і не сістэмны, але пазітыўны характар. Адначасова працягваўся беспрэцэдэнтны ціск на АГС і іх прадстаўнікоў, уключаючы ліквідацыю арганізацый, адміністрацыйны і крымінальны пераслед, а таксама шырокае злоўжыванне заканадаўствам аб супрацьдзеянні экстрэмізму.

**Працэдура рэгістрацыі грамадскіх аб’яднанняў і фондаў у Беларусі** застаецца надзвычай складанай, незразумелай, дарагой і працяглай, пры гэтым яна ўтрымлівае вельмі шырокі пералік падстаў для адмовы ў рэгістрацыі. Дзяржаўная пошліна за рэгістрацыю нацыянальнага грамадскага аб’яднання ў 10 разоў перавышае пошліну для камерцыйных арганізацый. Рэгістрацыя недзяржаўных установаў і асацыяцый юрыдычных асоб носіць заяўляльны характар, аднак патрабуецца абавязковае ўзгадненне назваў гэтых арганізацый да падачы дакументаў на рэгістрацыю, што на практыцы становіцца сур’ёзнай перашкодай для тых арганізацый, якія не з’яўляюцца прымальнымі для ўладаў.

Дзейнасць незарэгістраваных, у тым ліку прымусова ліквідаваных АГС, забаронена і з’яўляецца падставай для ўжывання крымінальнай адказнасці згодна з артыкулам 193.1 Крымінальнага кодэкса. У 2024 годзе быў вынесены першы абвінаваўчы прысуд па гэтым артыкуле пасля яго вяртання ў Кодэкс у 2022 годзе — адносна былой кіраўніцы Дабрачыннага грамадскага аб’яднання «Гродзенскі дзіцячы хоспіс», прымусова ліквідаванага ў жніўні 2021 года.

Міністэрства юстыцыі не публікуе статыстыку рэгістрацыі арганізацый за год. Аднак, паводле інфармацыі, прадстаўленай у адказе на запыт спецыяльных працэдур ААН, у 2024 годзе было зарэгістравана 26 грамадскіх аб'яднанняў. Паводле звестак Lawtrend, таксама на працягу года было зарэгістравана 5 фондаў і 25 недзяржаўных установаў, адна з якіх пазней прыняла рашэнне аб самастойнай ліквідацыі.

Працягвалася **прымусовая ліквідацыя АГС у Беларусі**, аднак да канца 2024 года гэты працэс крыху запаволіўся з-за таго, што большасць арганізацый ужо была ліквідавана. За год прымусова было ліквідавана як мінімум 227 арганізацый, яшчэ не менш за 144 АГС прынялі рашэнне аб самастойнай ліквідацыі.

З 6 ліпеня 2024 года пачалася кампанія па перарэгістрацыі рэлігійных арганізацый.

**Дзяржаўныя органы сур'ёзна ўмешваюцца ў дзейнасць і працэсы кіравання АГС.** Рэпрэсіўны апарат задзейнічаны як супраць арганізацый і іх прадстаўнікоў, што працуюць у Беларусі, так і супраць тых, хто быў вымушаны перанесці сваю дзейнасць за мяжу.

У 2023-2024 гадах былі ўведзены новыя механізмы ліцэнзавання, акрэдытацыі і сертыфікацыі, якія абмяжоўваюць магчымасці зацікаўленых асоб, уключаючы АГС, ажыццяўляць пэўныя віды дзейнасці ў культурна-забаўляльнай і адукацыйнай сферах, сферы фізічнай культуры.

У снежні 2024 года быў нацыяналізаваны Дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Надзея», створаны ў 1994 годзе для рэабілітацыі дзяцей з тэрыторый, забруджаных у выніку Чарнобыльскай катастрофы. Долі ў статутным фондзе, што належалі нямецкаму аб'яднанню «Сябры дзіцячага цэнтра «Надзея» ў Германіі» (50,7%) і беларускаму сацыяльна-экалагічнаму грамадскаму аб'яднанню «Жывое партнёрства» (каля 25%), былі перададзены ў дзяржаўную ўласнасць паводле пастановы ўрада.

Нормы аб публічнай справаздачнасці АГС патрабуюць прадастаўлення шырокага і часта празмернага аб'ёму інфармацыі.

**Сотні прадстаўнікоў АГС знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі. Актывізавалася практыка пераследу актывістаў, якія вымушаны пакінуць Беларусь.** Так, Следчы камітэт паведаміў аб узбуджэнні крымінальных спраў супраць 257 асоб, што знаходзяцца за мяжой, якія «з'яўляюцца прадстаўнікамі экстрэмісцкіх арганізацый» і нібыта «пачалі барацьбу за гранты і арганізавалі псеўдавыбары».

Атрымала шырокі распаўсюд практыка, калі сілавыя структуры **прызнаюць АГС экстрэмісцкімі фарміраваннямі**, іх прадстаўнікоў — кіраўнікамі або ўдзельнікамі такіх фарміраванняў, інфармацыйныя рэсурсы — экстрэмісцкімі матэрыяламі, а падтрымку АГС і іх мэтавых груп — фінансаваннем экстрэмісцкай дзейнасці.

Так, у 2024 годзе экстрэмісцкімі фарміраваннямі былі прызнаны ліквідаваныя раней арганізацыі OEEC, Беларускі нацыянальны моладзевы савет «РАДА», «Актыўным быць файна», Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў і іншыя. У сувязі з супрацоўніцтвам з прызнанай экстрэмісцкім фарміраваннем Беларускай асацыяцыяй журналістаў журналісту Ігару Карнею было прысуджана тры гады пазбаўлення волі.

Вядома больш за 100 выпадкаў прыцягнення да адказнасці па ч. 2 артыкула 24.15 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях (выкарыстанне замежнай бязвыплатнай дапамогі для ажыццяўлення тэрарыстычнай або іншай экстрэмісцкай дзейнасці ці іншых дзеянняў, забароненых заканадаўствам) у межах справы ініцыятывы INeedHelpBy, якая аказвала прадуктовую падтрымку палітвязням і іх сем'ям.

На беларускія АГС, што працуюць за мяжой, істотна ўплывае таксама заканадаўства краін іх знаходжання. Так, у 2024 годзе **многія арганізацыі, зарэгістраваныя ў Грузіі, былі вымушаны спыніць там сваю дзейнасць** з-за прыняцця заканадаўства аб замежных агентах. У Польшчы арганізацыі, у складзе кіраўніцтва якіх былі беларусы без сталага віду на жыхарства, сутыкнуліся з сур'ёзнымі цяжкасцямі пры адкрыцці банкаўскіх рахункаў.

**АГС істотна абмежаваны ў магчымасці шукаць, атрымліваць і выкарыстоўваць фінансавыя і матэрыяльныя рэсурсы** для дасягнення сваіх мэтаў. Абмежаванні найперш закранаюць замежнае фінансаванне — патрабуецца абавязковая рэгістрацыя любой атрыманай дапамогі; гэтае патрабаванне датычыць таксама ахвяраванняў ад беларускіх карпаратыўных донараў. Прыватныя ахвяраванні ад фізічных асоб-рэзідэнтаў Беларусі абмежаваны ў меншай ступені.

27 сакавіка 2024 года быў прыняты ўказ, які істотна пашырыў мэты атрымання і выкарыстання спонсарскай дапамогі АГС, што з'яўляецца пазітыўным крокам у змяненні заканадаўства, на неабходнасць якога працяглы час указваў грамадскі сектар. Аднак ва ўмовах прыгнёту грамадзянскай актыўнасці, масавай ліквідацыі АГС, ціску на бізнес і агульнай атмасферы рэпрэсій такія несістэмныя змены цяжка лічыць істотнымі для паляпшэння прававога поля для АГС.

Адменена ўведзенае ў канцы 2022 года патрабаванне, паводле якога арганізацыі павінны былі падаваць падатковыя дэкларацыі выключна ў электроннай форме: у 2024 і 2025 гадах АГС, што не займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, могуць падаваць дэкларацыі на папяровым носьбіце.

**Доступ да прававой дапамогі** для АГС унутры краіны па-ранейшаму абмежаваны з-за масавага пазбаўлення адвакатаў ліцэнзій і вымушанай рэлакацыі арганізацый, якія традыцыйна аказвалі юрыдычную падтрымку. У той жа час пашырылася практыка правядзення анлайн-кансультацый дзяржаўнымі органамі, хаця ў многіх выпадках яны носяць фармальны характар.

З’явіўся рэсурс pravonkobel.org, які забяспечвае для беларускіх АГС доступ да інфармацыйна-прававых матэрыялаў, датычных стварэння і дзейнасці арганізацый. Як і раней, АГС, што працуюць у выгнанні, маюць патрэбу ў юрыдычнай дапамозе як па пытаннях беларускага заканадаўства, так і па адпаведнасці законам краін, у якіх яны знаходзяцца.

# АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ:

## 5.3 (2023: 5.3)




У 2024 годзе арганізацыйны патэнцыял беларускіх арганізацый грамадзянскай супольнасці ў цэлым застаўся на ўзроўні папярэдняга года. Сектар АГС захаваў здольнасць функцыянаваць у складаных умовах і адаптавацца да выклікаў, аднак магчымасці для сістэмнага развіцця заставаліся абмежаванымі. Пры гэтым па-ранейшаму існавала істотная дыферэнцыяцыя паміж інстытуцыяналізаванымі НДА і нізавымі ініцыятывамі.

Паводле ацэнкі патрэб беларускіх АГС ва ўзмацненні арганізацыйнага патэнцыялу, праведзенай у траўні-чэрвені 2024 г. шляхам анлайн-апытання 70 рэспандэнтаў, 80% з іх адзначаюць, што разумеюць сутнасць паняцця «развіццё арганізацыйнага патэнцыялу». Большасць тых, хто ведае гэты тэрмін, асацыююць яго найперш са стратэгічным планаваннем і павышэннем кваліфікацыі каманды. Сярод асноўных бар’ераў на шляху развіцця патэнцыялу адзначаюцца недахоп фінансавання, няведанне, з чаго пачаць, расцярушанасць каманд па розных краінах і палітычная няпэўнасць.

Нягледзячы на працяглы ціск, у 2024 годзе шэраг АГС у Беларусі аднавілі актыўнасць пасля перыяду спаду і асцярогі.

**Праца з прыхільнікамі АГС у 2024 годзе была істотна абмежавана рызыкамі бяспекі.** Пасля прызнання шэрагу арганізацый «экстрэмісцкімі фарміраваннямі» многія з іх страцілі значную частку сваіх супольнасцяў і былі вымушаны закрыць публічныя каналы камунікацыі. Да таго ж АГС рэдка рэгулярна абнаўлялі базы прыхільнікаў, а камунікацыя часта будавалася праз нефармальныя каналы.

**Стратэгічнае планаванне** з'яўляецца распаўсюджанай практыкай у сектары АГС, аднак для многіх арганізацый яно ўспрымаецца як аднаразовая падзея ці форма каманднай сустрэчы, а не як бесперапынны працэс. Далёка не ўсе новыя ініцыятыўныя групы маюць сфармуляваныя місіі і прыярытэты.

Хаця некалькі арганізацый на працягу года распрацавалі сістэмы і планы **маніторынгу і ацэнкі**, большасць АГС не маюць выразных інструментаў для ацэнкі сваіх праграм, а доўгатэрміновая ацэнка эфектыўнасці дзейнасці АГС практычна не праводзіцца. У той жа час дзясяткі АГС на працягу года прайшлі арганізацыйную дыягностыку ў межах праекта BelarusBeehive, некаторыя арганізацыі пачалі выкарыстоўваць элементы самаацэнкі свайго патэнцыялу, хаця найчасцей гэта было звязана з патрабаваннямі донараў.

**Структура кіравання** ў многіх беларускіх АГС застаецца няпоўна фармалізаванай, выразны падзел роляў і абавязкаў паміж кіраўніцтвам і супрацоўнікамі часта адсутнічае або існуе толькі на паперы. Разам з тым, асобныя арганізацыі пачалі паляпшаць мадэлі кіравання — ствараюць кіраўнічыя, назіральныя або экспертныя рады, а таксама распрацоўваюць палітыкі камунікацыі, фінансавыя рэгламенты і правілы па прадухіленні канфлікту інтарэсаў.

**Кадравая сітуацыя ў сектары пагоршылася.** Працягваецца адток прафесіяналаў з Беларусі і сектара ў цэлым, назіраецца выгаранне, перагрузка супрацоўнікаў і слабы падзел абавязкаў унутры каманд. Паводле ацэнкі патрэб беларускіх АГС ва ўзмацненні арганізацыйнага патэнцыялу, крыху больш за палову рэспандэнтаў сумяшчаюць тры і больш роляў у межах сваіх арганізацый, а амаль 20% выконваюць пяць і больш функцый адначасова. 79% рэспандэнтаў гэтага апытання адзначылі цяжкі фізічны і ментальны стан каманды сярод асноўных праблем, з якімі яны сутыкнуліся.

Прыцягненне кваліфікаваных спецыялістаў становіцца ўсё цяжэйшым з-за рызык бяспекі і складаных умоў працы ў беларускіх АГС. Па-ранейшаму многія арганізацыі не заключаюць працоўныя кантракты са сваімі супрацоўнікамі. Развіццё кадравага патэнцыялу ў АГС адбываецца пераважна праз знешнія праграмы і трэнінгі, якія праводзяцца іншымі структурамі, а не ўнутры саміх арганізацый.

Валанцёрская актыўнасць унутры краіны істотна знізілася праз страх рэпрэсій, а ў эміграцыі — найперш з-за стомленасці, пераарыентацыі прыярытэтаў і рызык бяспекі.

**Узровень тэхнічнай аснашчанасці сектара** ў цэлым застаўся без істотных зменаў у параўнанні з 2023 годам. Абсалютная большасць АГС актыўна выкарыстоўвалі базавыя лічбавыя інструменты — воблачныя сэрвісы, платформы для сумеснай працы і камунікацыі і іншыя. Асобныя АГС павысілі эфектыўнасць працы дзякуючы свядомаму і кампетэнтнаму выкарыстанню AI-інструментаў.

Разам з тым, увага да сістэмнага забеспячэння лічбавай бяспекі знізілася, нягледзячы на ўзмацненне фішынгавых атак, скіраваных супраць актывістаў, незалежных медыя і АГС. У многіх выпадках арганізацыі комплексна ацэньваюць рызыкі і прымаюць дадатковыя меры бяспекі рэактыўна — пасля інцыдэнтаў, а не прэвентыўна, што захоўвае высокі ўзровень уразлівасці сектара. Нярэдка АГС ігнаруюць патрабаванні абароны персанальных дадзеных і стандарты GDPR.

# ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ:

## 6.7 (2023: 6.7)




Агульны бал фінансавай устойлівасці застаўся нязменным у параўнанні з 2023 годам і склаў 6.7.

Сектар АГС працягвае заставацца ў стане глыбокай фінансавай уразлівасці. У 2024 годзе сітуацыя была складанай і адначасова супярэчлівай: з аднаго боку, адзначаліся пэўныя паляпшэнні ў заканадаўстве, якое рэгулюе доступ арганізацый у Беларусі да мясцовага фінансавання, а з другога — пагаршэнне ўмоў праз рэпрэсіі і санкцыйныя абмежаванні. Як і ў 2023 годзе, фінансавы ландшафт характарызаваўся значным разрывам паміж арганізацыямі, якія працуюць унутры Беларусі, і тымі, хто дзейнічае ў выгнанні.

Нягледзячы на агульную атмасферу страху і рэпрэсій, некаторыя арганізацыі ўнутры Беларусі адзначылі **нязначнае павелічэнне доступу да ўнутранага фінансавання**.

Назіраўся аптымізм адносна павелічэння сродкаў і напрамкаў, на якія праводзяцца конкурсы дзяржаўнай сацыяльнай замовы (ДСЗ) у сферах аховы здароўя і сацыяльнага абслугоўвання. Так, аб'ём запланаваных сродкаў на рэалізацыю паслуг і праектаў у рамках ДСЗ у сферы ВІЧ і туберкулёзу склаў больш за 235 000 еўра ў 2024 годзе, што на 50% больш, чым у 2023. Выканаўцамі ДСЗ сталі 9 грамадскіх арганізацый, у тым ліку РГА «БелАЮ», РМГА «Сустрэча», БГА «Пазітыўны рух», РГА «Людзі ПЛЮС», Беларускі чырвоны крыж і ягоныя рэгіянальныя аддзяленні.

Сума, выдзеленая з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў на падтрымку нізавых грамадзянскіх ініцыятыў павялічылася ў 1,5 разы і склала каля 600 000 еўра. Пры гэтым колькасць заявак на гэтыя конкурсы паменшылася з-за павелічэння фармальных патрабаванняў, якія маглі выканаць далёка не ўсе ініцыятывы. Да таго ж у бягучых умовах існавання грамадзянскай супольнасці ў краіне гэтыя конкурсы становяцца крыніцай дыскрымінацыі адных ініцыятыў у параўнанні з іншымі.

30 верасня набыла моц новая рэдакцыя Указа №300 «Аб бязвыплатнай (спонсарскай) дапамозе», якая пашырыла пералік мэтаў для спонсарскай падтрымкі, даўшы грамадскім аб'яднанням магчымасць атрымліваць яе на любую дзейнасць па дасягненні статутных мэтаў. Пры гэтым на практыцы бізнес-структуры сталі менш зацікаўлены ў фінансаванні АГС.

**Па-ранейшаму складана незалежным зарэгістраваным АГС, якія працягваюць працаваць у Беларусі.** Для іх асноўнымі легальнымі крыніцамі атрымання сродкаў застаюцца ахвяраванні і ўнутраная спонсарская дапамога. Да замежнага фінансавання маюць доступ пераважна арганізацыі, блізкія да дзяржавы, бо праекты толькі такіх арганізацый рэгіструе Дэпартамент па гуманітарнай дзейнасці. Акрамя таго, незалежныя АГС, якія засталіся ў Беларусі, сутыкаюцца з абмежаваннем магчымасцяў прадастаўлення адукацыйных ці сацыяльных платных паслуг праз увядзенне патрабаванняў ліцэнзавання, акрэдытацыі або абавязковага знаходжання ў рэестрах.

Працягвалася актыўная практыка крымінальнага пераследу асоб за ахвяраванні фондам, якія аказваюць дапамогу пацярпелым ад рэпрэсій, і іншым структурам. У 2024 годзе назіралася чарговая хваля ціску на тых, каго раней ужо пераследвалі за данаты. У Беларусі з'явіліся білборды з папярэджаннямі кшталту «Любіш данаціць — любі і адказваць». Гэта фарміруе атмасферу напружанасці і страху, у выніку чаго нават людзі, якія раней рэгулярна падтрымлівалі дабрачынныя фонды, што працуюць афіцыйна, сталі больш асцярожнымі і радзей рабіць ахвяраванні.

Для АГС, якія дзейнічаюць у выгнанні, заставаўся даволі шырокі **доступ да знешняга фінансавання**; абвяшчаліся грантавыя конкурсы з боку еўрапейскіх і амерыканскіх донараў. У перыяд з 2020 па канец 2024 года Еўразвяз выдаткаваў 170 мільёнаў еўра на падтрымку дэмакратычных сіл Беларусі, у тым ліку — грамадзянскай супольнасці. Хаця аб'ёмы замежнага фінансавання былі значныя, праз павелічэнне колькасці АГС за мяжой канкурэнцыя таксама ўзрасла. Фінансавыя мадэлі АГС у рэлакацыі пераважна трымаюцца на грантах.

Некаторыя донары паводле палітыкі бяспекі адмаўляюцца падтрымліваць праекты, якія рэалізуюцца непасрэдна ўнутры Беларусі, што прыводзіць да выпадзення некаторых тэм з парадку дня. Нават пры наяўнасці грантаў, АГС у Беларусі сутыкаюцца з немагчымасцю выканання ўсіх умоў пагадненняў з меркаванняў бяспекі, напрыклад, неабходнасць прадастаўлення пашпартных дадзеных выканаўцаў праекта. Акрамя таго, арганізацыі, якія адміністрююць гранты для тых, хто застаўся ў Беларусі (фіскальныя партнёры), могуць браць за свае паслугі ад 10% да 30% ад памеру і без таго невялікіх грантаў, што зніжае эфектыўнасць падтрымкі. На фінансавую даступнасць замежных рэсурсаў істотна ўплывае і санкцыйны рэжым у дачыненні да Беларусі.

У 2024 годзе працягнулася заўважная тэндэнцыя на пошук альтэрнатыўных крыніц фінансавання. Напрыклад, адзначаецца рост аказання платных паслуг мэтавым групам, у Беларусі гэта часта адбываецца праз рэгістрацыю арганізацый у выглядзе камерцыйных структур або індывідуальных прадпрымальнікаў.

У ліпені 2024 года была запушчана беларуская краўдфандынгавая платформа «Гронка». За паўгады яна сабрала 50 000 еўра і стала перспектыўным інфраструктурным рашэннем для невялікіх культурных і сацыяльных праектаў. Праўда, магчымасці «Гронкі» абмежаваны для збору грошай ініцыятывамі ўнутры Беларусі, бо ў студзені 2025 года яна была прызнана экстрэмісцкім фарміраваннем.

Замежныя краўдфандынгавыя платформы накшталт Kickstarter, GoFundMe, Patreon ці BuyMeACoffee з'яўляюцца бяспечнымі для арганізацый унутры Беларусі з пункту гледжання нацыянальнага заканадаўства. Але часта гэтыя платформы недаступныя для карыстальнікаў з Беларусі праз блакіроўку на тэрыторыі краіны і санкцыйныя абмежаванні — немагчыма легальна запусціць

праект у якасці стваральніка з беларускай рэгістрацыяй або адрасам, а таксама могуць не прымацца онлайн-плацяжы з беларускіх банкаўскіх картак.

У 2024 годзе колькасць сродкаў, сабраных платформай «Будуй Сваё» (раней «Новая Беларусь»), павялічылася да 83 000 еўра, што амаль ўдвая больш, чым 47 000 у 2023 годзе. Гэты праект дазваляе беларусам у Літве і Польшчы ахвяраваць частку сваіх падаткаў (1.2% і 1.5% адпаведна) на асобныя праекты і атрымліваць справаздачу адносна іх рэалізацыі. Магчымасцю збіраць адлічэнні ад падаткаў скарысталіся і дзясяткі іншых арганізацый у краінах ЕЗ. Напрыклад, «Цэнтар беларускай супольнасьці і культуры ў Вільні» атрымаў праз гэты механізм больш за 8000 еўра. Беларускія АГС, зарэгістраваныя за мяжой, асабліва ў Польшчы, таксама сталі больш звяртацца па лакальныя гранты ў краінах рэлакацыі.

Сітуацыя з **фінансавым менеджмэнтам** застаецца на ўзроўні мінулага года. Зарэгістраваныя АГС у Беларусі ажыццяўляюць фінансавае кіраванне ў адпаведнасці з патрабаваннямі беларускага заканадаўства. АГС у выгнанні маюць больш магчымасцяў для ўкаранення эфектыўных метадаў, але многія з іх не маюць уласных фінансавых менеджэраў і не заўсёды выкарыстоўваюць прасунутыя працэдуры для забеспячэння празрыстасці і падсправаздачнасці, абгрунтоўваючы гэта рызыкамі бяспекі і недахопам рэсурсаў.

# АДВАКАТАВАННЕ:

## 6.2 (2023: 6.2)



Ландшафт адвакатыўнай працы грамадзянскай супольнасці ў 2024 годзе ў цэлым заставаўся ў тым жа стане, якім ён склаўся пасля крызісаў 2020-2021 гадоў. АГС, якія працягваюць дзейнічаць унутры краіны, больш адвакатуюць на ўзроўні мясцовых уладаў і спецыялістаў дзяржорганаў, але асцерагаюцца выносіць пытанні на нацыянальны парадак дня або прыцягваць шырокую медыйную ўвагу. АГС, што працуюць у замежжы, працягваюць выкарыстоўваць міжнародныя механізмы ўплыву, але некаторыя з іх зноў пачалі адрасоўваць свае месэджы ўладам Беларусі.

**Каналы камунікацыі з дзяржаўнымі структурамі застаюцца нязменнымі. Увядзенне** для асобных АГС эксклюзіўных механізмаў узаемадзеяння з уладамі ў адпаведнасці з законам «Аб асновах грамадзянскай супольнасці» не актывізавала іх адвакатыўную працу. Асноўнымі інструментамі адвакатавання застаюцца петыцыі — часцей індывідуальныя, чым калектыўныя — і звароты да ўладаў праз сацыяльныя сеткі. Асабліва вырасла роля TikTok як канала для адвакатавання, у тым ліку праз адчувальнасць уладаў да зместу, які там з'яўляецца. Папулярная платформа Petitions.by, на якой на працягу 2024 г. было створана каля 200 калектыўных зваротаў (прыкладна столькі ж, як і ў 2023-м), напрыканцы года была ўключана ў пералік экстрэмісцкіх матэрыялаў.

Атмасфера рэпрэсій і страху перад пераследам спрыяе **глыбокай самацэнзуры сярод незалежных АГС**. Альтэрнатыўныя меркаванні выключаюцца з афіцыйных працэсаў прыняцця рашэнняў, а падсправаздачнасць дзяржаўных органаў грамадству адсутнічае.

**Абмеркаванне законапраектаў у электроннай форме** застаецца адным з нямногіх даступных механізмаў, якія дазваляюць грамадскасці ўплываць на заканадаўчы парадак дня. Аднак вынікі гэтых абмеркаванняў часта падаюцца ў фармальным выглядзе і не суправаджаюцца паўнавартасным аналізам атрыманых прапаноў. У 2024 годзе на публічнае абмеркаванне было вынесена толькі 65 праектаў прававых актаў — найменшая колькасць з 2017 года. Разам з тым, захавалася пазітыўная тэндэнцыя, якая праявілася яшчэ ў 2023 годзе: узрасла актыўнасць грамадзян у каментаванні праектаў. У сярэднім на адзін праект у 2024 годзе паступіла больш за 30 каментароў — значна больш, чым у 2021-2022 гадах, калі сярэдні паказчык складаў усяго 6-7 водгукаў. Адным з нешматлікіх прыкладаў уліку пазіцыі АГС стала працягненне тэрміну абмеркавання рэзананснага праекта Кодэкса аб ахове здароўя на паўтары месяцы пасля адпаведнай петыцыі некалькіх арганізацый.

**Праўладныя і «патрыятычныя» арганізацыі ў Беларусі дзейнічаюць у больш свабодных умовах** і без рызыкі пераследу, але іх адвакатыўная актыўнасць невялікая і пераважна тычыцца дробных пытанняў — перайменавання вуліц, асобных культурных аспектаў або даносаў для папаўнення спісаў забароненых кніг ці экстрэмісцкіх матэрыялаў. Іх ініцыятывы часта падтрымліваюцца дзяржавай, асабліва калі яны супадаюць з ідэалагічным курсам, напрыклад, ініцыятывы супраць «прапаганды ЛГБТК».

Адвакатаванне АГС па-за межамі Беларусі **суправаджаецца кампаніямі па фармаванні грамадскай думкі, петыцыямі, а таксама асвятленнем у СМІ** поспехаў ва ўзаемадзеянні з міжнароднымі актарамі. У Беларусі ж медыйная праца робіцца цішэй: яна рэдка асвятляецца ў сацыяльных сетках або на сайтах арганізацый і часта мімікруе пад нефармальную актыўнасць неарганізаваных грамадзян, блогераў або нават пад працу дзяржаўных структур.

У замежжы асноўнымі актарамі адвакатавання сталі структуры вакол Офіса Святланы Ціханоўскай, Аб'яднанага пераходнага кабінета і Каардынацыйнай рады. Выбары ў новы склад Каардынацыйнай рады прайшлі па спісах, набліжаных да партыйных, і орган стаў больш пазіцыянаваць сябе як пратапарламент, але працягвае прэтэндаваць і на ролю прадстаўніка грамадзянскай супольнасці.

Праваабарончыя, моладзевыя і іншыя АГС узаемадзейнічаюць з гэтымі палітычнымі структурамі па-рознаму, але найчасцей у рэжыме каардынацыі: абмяркоўваюць прыярытэты, узгадняюць пазіцыі, падтрымліваюць агульныя тэмы.

Актыўнае адвакатаванне вядзецца ў краінах з найбольшай колькасцю эмігрантаў з Беларусі — Польшчы, Літве, Украіне, а таксама ў Грузіі і ЗША. **Найбольшы водгук у беларусаў за мяжой атрымліваюць тэмы, якія непасрэдна закранаюць умовы іх жыцця ў канкрэтных краінах**: пытанні легалізацыі, доступу да медыцыны і сацыяльных гарантый, атрымання пашпартоў, магчымасці карыстання банкаўскімі паслугамі, а таксама супрацьдзеянне кампаніям, накіраваным на дыскрэдытацыю беларусаў.

Удзел беларускіх АГС замежжа ў адвакатаванні праблем сярод грамадства краін знаходжання пакуль эпізадычны, аднак гэтая тэндэнцыя паступова ўзмацняецца. Адным з прыкладаў стала лакалізаваная ў Польшчы кампанія з нагоды згвалтавання і забойства беларускі Лізы ў Варшаве.

АГС, што дзейнічаюць у выгнанні, **актыўна ўдзельнічаюць у працы міжнародных адвакатыўных пляцовак высокага ўзроўню**: працэдурах ААН, кантактнай групе Рады Еўропы, беларуска-амерыканскім дыялогу і кансультатыўнай групе «Беларусь – Еўразвяз». Яны таксама ўдзельнічаюць у распрацоўцы і прасоўванні дарожных мап і ацэнках патрэб па сектарах дзейнасці, што мае на мэце ўплыў на палітыку Еўракамісіі ў сферы фінансавання беларускай грамадзянскай супольнасці. Праз рызыку рэпрэсій удзел АГС знутры Беларусі ў гэтых працэсах адбываецца мінімальна альбо завочна.

Увогуле, беларускае грамадства ўспрымаецца ўсё часцей як пасіўная аўдыторыя — аб'ект інфармавання і ўплыву, да патрэб якога можна апеляваць, але ад якога не чакаецца самастойнай артыкуляцыі ўласных інтарэсаў і грамадскіх дзеянняў.

**Працягваліся намаганні па паляпшэнні прававых умоў для сектара АГС**. Сярод паспяховых крокаў — прыпыненне напрыканцы 2024 года ўведзенага напачатку года абавязку падаваць падатковыя дэкларацыі выключна ў электроннай форме з аплатай электроннага ключа нават для арганізацый, якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама вяртанне ў Кодэкс грамадзянскай судавытворчасці працэсуальнай фігуры — прадстаўніка грамадскасці ад грамадскіх аб'яднанняў. У 2024 годзе шматгадовыя высілкі многіх АГС па змяненні Указа №300 «Аб бязвыплатнай (спонсарскай) дапамозе» дасягнулі выніку, і новая рэдакцыя пашырыла пералік мэтаў, дзеля якіх АГС могуць атрымліваць спонсарскую дапамогу. АГС замежжа адвакатавалі ўвядзенне выключэнняў з санкцыйнага рэжыму ЕЗ для фінансавання грамадскай дзейнасці.

# АКАЗАННЕ ПАСЛУГ:
# 5.6 (2023: 5.5)




Пагаршэнне ўмоў дзейнасці і скарачэнне рэсурсаў прывялі да зніжэння разнастайнасці, даступнасці і ўстойлівасці паслуг, якія аказваюць АГС.

У 2024 годзе спектр паслуг, якія аказвалі беларускія АГС, заставаўся адносна шырокім, аднак іх **разнастайнасць прыкметна скарацілася**. Да таго ж паслугі ў асноўным маюць праектны, кароткатэрміновы характар, а дзейнасць многіх АГС часта зводзіцца да правядзення разавых мерапрыемстваў

Асабліва ў 2024 годзе пацярпела адукацыйная сфера: многія АГС (АБФ, Вольны Беларускі Ўніверсітэт, Нацыя лідэраў і іншыя) былі прызнаны «экстрэмісцкімі фарміраваннямі», што істотна звузіла магчымасці для аказання адукацыйных паслуг, асабліва ўнутры краіны.

Некаторыя арганізацыі працягнулі працу пад новымі назвамі ці ў іншым фармаце, але часта гублялі сувязь з ранейшымі мэтавымі групамі.

Адначасова з'явілася больш дробных валанцёрскіх і лакальных ініцыятыў, якія эксперыментавалі з рознымі формамі паслуг, аднак недахоп устойлівага фінансавання і каардынацыі прыводзіў да фрагментацыі, дублявання намаганняў і зніжэння якасці паслуг.

У Беларусі ўсё большая колькасць паслуг, якія раней прапаноўвалі незалежныя АГС, аказваюцца праз **ГОНГА і дзяржаўныя ўстановы**. Аднак іх дзейнасць абмяжоўваецца рамкамі дзяржаўнай палітыкі і не заўсёды адпавядае рэальным патрэбам беніфіцыяраў.

Беларускія АГС па-ранейшаму **арыентуюцца на патрэбы сваіх мэтавых груп**, аднак сістэмную працу па іх выяўленні і аналізе вядуць пераважна больш вопытныя ці буйныя арганізацыі. Многія ж новыя ініцыятывы дзейнічаюць хутчэй інтуітыўна і абапіраюцца на свой папярэдні досвед.

Асноўнымі атрымальнікамі паслуг АГС у 2024 годзе заставаліся моладзь, людзі, пацярпелыя ад рэпрэсій, прадстаўнікі розных іншых уразлівых груп, а таксама актывісты і іншыя арганізацыі грамадзянскай супольнасці. Пры гэтым **доступ да паслуг АГС стаў больш абмежаваным і залежным ад узроўню даверу і асабістых сувязяў унутры супольнасцяў**, бо інфармацыя пра магчымасці атрымаць дапамогу часта не распаўсюджвалася публічна, а ўдзел у мерапрыемствах патрабаваў асабістай рэкамендацыі ці праверкі асобы, што істотна зніжала даступнасць такіх мерапрыемстваў для новых людзей. Асабліва складанай стала сітуацыя з падтрымкай для ЛГБТК+ супольнасці ў Беларусі: пасля ад'езду большасці спецыялістаў і прыпынення ў краіне публічнай дзейнасці АГС, якія працуюць з гэтай мэтавай групай, іх паслугі засталіся даступнымі толькі для вузкага кола людзей.

У той жа час АГС спрабавалі **павялічыць інклюзіўнасць сваёй працы** — часцей улічвалі патрэбы бацькоў з малымі дзецьмі, асоб з інваліднасцю, людзей сталага ўзросту, а таксама забяспечвалі безбар'ерны доступ да сваіх офісаў і мерапрыемстваў. Згодна з даследаваннем «Інклюзіўнасць, гендэрная роўнасць і экалагічнасць у беларускіх грамадскіх арганізацыях», праведзеным арганізацыяй «ІншыЯ», частка АГС на сталай аснове ўкараняе ў сваю працу розныя інклюзіўныя практыкі. Напрыклад, ствараюць безбар'ернае асяроддзе ў офісах, абсталёўваюць гендэрна-нейтральныя прыбіральні, распрацоўваюць версіі сваіх сайтаў для людзей са слабым зрокам. Разам з тым, ніводная з арганізацый пакуль не выкарыстоўвае на 100% усе рэлевантныя для яе інклюзіўныя практыкі.

Пераважная большасць АГС — і ў краіне, і за мяжой — аказвалі паслугі за кошт падтрымкі міжнародных донараў, але ў 2024 годзе **вырасла колькасць АГС, якія часткова кампенсуюць свае выдаткі за кошт аказання платных паслуг** або ўмовы да ўдзельнікаў трэнінгаў і канферэнцый узяць на сябе пэўныя выдаткі.

Да таго ж, частка АГС у Беларусі дзейнічаюць у якасці камерцыйных суб'ектаў і аказваюць паслугі альбо па рынкавых коштах, альбо па коштах, якія часткова кампенсуюць іх выдаткі.

У Беларусі ў сферы аховы здароўя і сацыяльнага абслугоўвання працягваў дзейнічаць **механізм дзяржаўнай сацыяльнай замовы**, які заставаўся даступным толькі абмежаванаму колу АГС. На працягу 2024 г. у межах гэтага механізма ў галіне прафілактыкі ВІЧ і туберкулёзу рэалізоўвалася 21 дамова з дзевяццю арганізацыямі.

**Стаўленне беларускіх уладаў да ўнёску АГС у аказанне сацыяльных паслуг заставалася супярэчлівым.** З аднаго боку, у краіне працягвалася мэтанакіраваная паклёпніцкая кампанія супраць шырокага кола арганізацый, а таксама ўводзіліся новыя патрабаванні да ліцэнзавання, акрэдытацыі і сертыфікацыі, якія абмежавалі магчымасці для АГС ажыццяўляць пэўныя паслугі ў сацыяльнай, культурнай, адукацыйнай, спартыўнай і іншых сферах. З другога боку, улады працягваюць разглядаць абмежаваную частку АГС, што легальна працуюць у Беларусі, як партнёраў у аказанні сацыяльных паслуг, а асобныя прадстаўнікі дзяржаўных структур прызнаюць, што не здольны самастойна задаволіць увесь спектр патрэб грамадства і дэманструюць зацікаўленасць у экспертызе і навучанні з боку спецыялістаў з недзяржаўнага сектара, асабліва ў сферы сацыяльнага абслугоўвання і прыцягнення сродкаў. У той жа час гэтыя працэсы суправаджаюцца ўзмацненнем кантролю над дзейнасцю АГС.

# ІНФРАСТРУКТУРА СЕКТАРА:

## 5.6 (2023: 5.5)



Інфраструктура, якая падтрымлівае сектар беларускіх АГС, у 2024 годзе саслабла. Яна застаецца моцна залежнай ад замежнага фінансавання, мае абмежаваныя магчымасці для развіцця і толькі часткова задавальняе патрэбы АГС як унутры краіны, так і ў эміграцыі.

У 2024 годзе **беларускія інфраструктурныя арганізацыі і рэсурсныя цэнтры**, якія прапануюць АГС і актывістам тэхнічную дапамогу, магчымасці для навучання, нэтворкінгу і арганізацыі мерапрыемстваў, працягвалі дзейнічаць па-за межамі Беларусі. Доступ да іх паслуг для арганізацый унутры краіны заставаўся вельмі абмежаваным.

Негатыўны ўплыў на інфраструктуру для беларускіх АГС у Грузіі мела закрыццё прастор «Кропка» ў Тбілісі і Media Hub у Батумі, якія на працягу некалькіх гадоў прадастаўлялі каворкінг, пляцоўку для правядзення мерапрыемстваў і іншую падтрымку для арганізацый і актывістаў. У Літве, Польшчы і Германіі падобныя прасторы працягвалі сваю дзейнасць, аднак сутыкнуліся з фінансавымі цяжкасцямі. Пры гэтым у Беларусі з'яўляліся новыя пляцоўкі для правядзення сустрэч і мерапрыемстваў АГС, аднак яны былі не заўсёды запатрабаванымі з-за рызык бяспекі, абмежаваных рэсурсаў і нізкай бачнасці грамадскага сектара.

**АГС мелі доступ да шырокага спектру навучання, ментарскай і кансультацыйнай падтрымкі, асабліва за мяжой.** Шэраг адукацыйных праграм былі скіраваны на развіццё базавых кампетэнцый у сферы грамадскай дзейнасці і кіравання АГС. Напрыклад, OEEC рэалізавала анлайн-курс «Мае Сэнс. Праектны менеджмэнт у АГС», які паказаў рэкордныя вынікі па колькасці ўдзельнікаў і эфектыўнасці навучання. Вольны Беларускі Ўніверсітэт правёў праграму для менеджэраў АГС «Лідэры будучыні», а арганізацыя «ІншыЯ» запусціла курс па арганізацыі мерапремстваў «РАБІ СМЕЛА!». Беларускі нацыянальны моладзевы савет «РАДА» працягваў курсы па фандрэйзінгу, кіраванні праектамі, а таксама завяршыў праграму падрыхтоўкі трэнераў.

Праводзілася навучанне і па больш спецыялізаваных тэмах. Арганізацыя CSO Fusion прапанавала курс па прынцыпах належнага дэмакратычнага кіравання ў АГС з наступнай ментарскай і кансультацыйнай падтрымкай. Ініцыятыва «Журналісты за талерантнасць» навучала эфектыўнаму выкарыстанню штучнага інтэлекту ў журналістыцы і актывізме, а РАДА рэалізавала адукацыйную праграму «(Ня)згода ў дзеянні», прысвечаную асновам канфліктaлогіі, медыяцыі і негвалтоўнай камунікацыі.

Разам з тым, **многія навучальныя магчымасці застаюцца недаступнымі для ўдзельнікаў з Беларусі з-за візавых абмежаванняў і рызык бяспекі.** Праблемай таксама з'яўляецца недахоп кваліфікаваных спецыялістаў па арганізацыйным развіцці, фандрэйзінгу і бяспецы ўнутры краіны. Агулам у сектары застаецца незакрытай патрэба ў доўгатэрміновых праграмах арганізацыйнага развіцця.

Такія арганізацыі, як Фонд BYSOL, Беларуская Рада культуры і праект Belarus Beehive, працягвалі **пераразмяркоўваць сродкі, атрыманыя ад замежных донараў, сярод АГС** у Беларусі і за мяжой у рамках конкурсаў малых грантаў. Беларускі Дом правоў чалавека, БНМС «РАДА» і праграма «Грамадзянская супольнасць для развіцця Беларусі» прапаноўвалі фінансавую падтрымку для развіцця арганізацыйнага патэнцыялу беларускіх АГС.

Доступ арганізацый унутры Беларусі да гэтых сродкаў заставаўся абмежаваным з-за санкцыйнага рэжыму і рызыкі для атрымальнікаў.

Паводле даследавання ўзаемадзеяння ў беларускай грамадзянскай супольнасці ад BIPART, **беларускія АГС у цэлым гатовы і зацікаўлены ва ўзаемадзеянні**, асабліва калі знаходзяцца за мяжой. Супрацоўніцтва часта ўзнікае як адказ на агульныя выклікі, патрэбу ў адвакатаванні і аптымізацыі рэсурсаў.

У чэрвені 2024 г. чатыры АГС, якія аказваюць падтрымку палітычным рэпрэсаваным — Грамадзянская кампанія BY_Help, Фонд BYSOL, Ініцыятыва Dissidentby і Фонд «Краіна для жыцця» — абвесцілі пра стварэнне сумеснай службы «Хуткай гуманітарнай дапамогі», каб каардынаваць супольныя дзеянні і прапанаваць мэтавым групам увесь магчымы спектр дапамогі. Узмацнілася супрацоўніцтва паміж жаночымі арганізацыямі і ініцыятывамі, якія дзейнічаюць па-за межамі Беларусі і супрацьстаяць гендэрнаму і хатняму гвалту. Акрамя таго, АГС працягвалі аб'ядноўвацца для арганізацыі сумесных мерапрыемстваў і праектаў.

Разам з тым, паміж арганізацыямі розных тэматычных і геаграфічных груп паглыбіліся разрывы і канкурэнцыя за рэсурсы, што зніжала ўзровень супрацоўніцтва і часцей прыводзіла да канфліктаў.

У Беларусі ж супрацоўніцтва АГС застаецца мінімальным, адбываецца пераважна на ўзроўні асабістых сувязяў і ў рэгіёнах, а кантакты з часткай сектара ў выгнанні разглядаюцца як патэнцыйна рызыкоўныя.

**Супрацоўніцтва сектара АГС з іншымі сектарамі заставалася абмежаваным.** АГС «ІншыЯ», Razam e.V. і «Журналісты за талерантнасць» у 2024 годзе распачалі праект «Together for Values — JA», каб аднавіць сувязі паміж грамадскім сектарам і медыя, павысіць бачнасць працы НДА і прысутнасць уразлівых груп у інфармацыйнай прасторы.

Узаемадзеянне з бізнесам па-за межамі Беларусі адбывалася кропкава і пераважна на ўзроўні асабістых сувязяў альбо праз бізнес-асацыяцыі. Напрыклад, Асацыяцыя беларускага бізнесу за мяжой падпісала мемарандумы аб супрацы і праводзіла сумесныя мерапрыемствы з Фондам BYSOL і Беларускай Радай культуры. Пры гэтым у Беларусі прайшло некалькі мерапрыемстваў, дзе сацыяльныя ініцыятывы маглі атрымаць ментарскую і фінансавую падтрымку ад прыватных кампаній і прадпрымальнікаў. Акрамя таго, у краіне рэалізоўвалася некалькі праектаў, дзе супрацоўнічалі прыватныя кампаніі, агенцыі ААН і АГС.

Узаемадзеянне паміж арганізацыямі, якія легальна дзейнічаюць у Беларусі, і дзяржаўнымі структурамі было магчыма толькі ў межах палітычна нейтральных тэм.

# ГРАМАДСКІ ІМІДЖ:

# 6.0 (2023: 5.8)




Беларускія АГС у 2024 годзе працягвалі існаваць ва ўмовах рэпрэсій і мэтанакіраванай кампаніі па дыскрэдытацыі сектара праз дзяржаўныя медыя, а іх месца імкнуліся замясціць ГОНГА. У спалучэнні з абмежаваным медыйным асвятленнем, саслабеўшымі сувязямі з грамадскасцю, публічнымі канфліктамі і размыццём межаў паміж сектарамі гэта прывяло да прыкметнага пагаршэння грамадскага іміджу АГС — ацэнка знізілася на 0,2 бала.

**У 2024 годзе прысутнасць беларускіх АГС у медыя заставалася абмежаванай і пераважна негатыўна афарбаванай.**

Праект FactcheckBY выявіў сістэматычную дэзінфармацыю ў дзяржаўных СМІ Беларусі, накіраваную на скажэнне разумення грамадзянскай супольнасці: «Сапраўдныя грамадскія ініцыятывы замяняюцца праўладнымі арганізацыямі… [каб] нейтралізаваць само паняцце грамадзянскай супольнасці як сферы незалежнай грамадзянскай актыўнасці, замяніўшы яе імітацыйнымі структурамі, цалкам падкантрольнымі дзяржаве».

Пры гэтым нават у незалежных медыя дзейнасць АГС адлюстроўваецца недастаткова і часта праз прызму канфліктных і праблемных сітуацый у сектары, у той час як пазітыўныя дасягненні і паспяховыя практыкі застаюцца па-за ўвагай. Узаемадзеянне АГС і незалежных СМІ часта ўскладняецца і з-за экстрэмісцкага статусу аднаго ці другога боку.

У выніку станоўчы аналіз ролі АГС у медыйнай прасторы гучыць рэдка і не дасягае шырокай аўдыторыі.

У 2024 годзе не праводзіліся даступныя сацыялагічныя даследаванні, наўпрост накіраваныя на вывучэнне іміджу АГС у беларускім грамадстве, аднак пра сітуацыю можна меркаваць па ўскосных дадзеных. Так, у ліпені 2021 года 37% беларусаў давяралі праваабарончым арганізацыям, што разам з незалежнымі медыя і праваслаўнай царквой ставіла іх на першае месца сярод усіх грамадскіх інстытутаў у Беларусі. У 2024 годзе, паводле апытання «Стаўленне беларусаў да дзейнасці праваабарончай супольнасці«, толькі **14% гарадскога насельніцтва Беларусі "ведаюць пра дзейнасць недзяржаўных праваабарончых арганізацый і адэкватна ацэньваюць сітуацыю з правамі чалавека"**. Большасць рэспандэнтаў мала інфармаваны пра праваабарончую супольнасць: 59% не ведаюць праваабарончых арганізацый, а многія блытаюць іх з праваахоўнымі органамі (13%) і судамі (11%); 8% рэспандэнтаў знаёмы з дзейнасцю Праваабарончага цэнтра «Вясна».

Даследаванне прадэмакратычнай часткі беларускага грамадства, праведзенае ў траўні 2024 года Цэнтрам новых ідэй і праектам «Ёсць пытанне», паказала, што сярод грамадскіх ініцыятыў **рэспандэнты найбольш ведаюць «Кіберпартызан», ПЦ «Вясна», Полк імя Кастуся Каліноўскага, BySol і ByHelp** і ўспрымаюць іх дзейнасць як карысную для Беларусі.

Актывісты з Беларусі адзначаюць негатыўныя грамадскія настроі да любой актыўнасці АГС у цэлым, звязаныя са страхам рэпрэсій. Спробы ўмацоўваць свой імідж праз публічнасць і ўзаемадзеянне з медыя часта прыводзяць да таго, што гуманітарныя ініцыятывы глыбей уцягваюцца ў прасоўванне дзяржаўнага парадку дня. У выніку любое **ўзаемадзеянне з АГС можа ўспрымацца як хаджэнне па мінным полі**: альбо як неэтычнае, альбо як небяспечнае.

Хаця АГС па-за межамі Беларусі маюць больш магчымасцяў для прасоўвання свайго іміджу, рызыкі бяспекі застаюцца высокімі і для іх. **Праблема балансу паміж публічнасцю і бяспекай** становіцца асабліва вострай для арганізацый, якім у Беларусі нададзены статус экстрэмісцкага фарміравання: нават найбольш вядомыя арганізацыі часта маюць толькі аднаго-двух публічных прадстаўнікоў, а большая частка дзейнасці застаецца ананімізаванай. Гэта таксама перашкаджае ўмацаванню іміджу — складана давяраць тым, каго не ведаеш.

Спрэчкі вакол размеркавання еўрапейскага фінансавання арганізацыямі па-за межамі Беларусі і публічныя канфлікты ў АГС узмацнілі прапагандысцкія наратывы пра «карупцыйнасць» сектара і нанеслі дадатковую шкоду яго рэпутацыі.

**Беларускія ўлады разглядаюць незалежныя АГС як пагрозу, а не як рэсурс экспертызы або партнёра.** ГОНГА, наадварот, падтрымліваюцца ўладамі і выкарыстоўваюцца ў краіне як інструмент кантролю і замяшчэння незалежных структур.

У 2024 годзе ГОНГА спрабавалі нарасціць свой уплыў і палепшыць імідж, аднак гэта хутчэй прыводзіла да пагаршэння іміджу сектара ў цэлым. Пасля прыпынення сяброўства Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа (БТЧК) у Міжнароднай федэрацыі таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца арганізацыя страціла больш за палову свайго бюджэту. Прадстаўнікі таварыства звярнуліся да ўладаў з просьбай атрымаць падтрымку ў памеры 1% ад заробкаў усіх медыцынскіх работнікаў Беларусі (за кошт саміх медработнікаў), працягваючы тым самым практыку «добраахвотна-прымусовых» пабораў у дзяржустановах і ўніверсітэтах. Дзяржаўнае тэлебачанне на гэтым фоне спрабавала «адбяліць» рэпутацыю БТЧК, аднак гаворка ішла не пра карупцыю, паборы або ўдзел арганізацыі ў вывазе дзяцей з акупаваных тэрыторый Украіны, а пра недатычнасць БТЧК да чорнай трансплантalогіі з выкарыстаннем украінскіх дзяцей, у чым арганізацыю ніхто і не абвінавачваў.

Не спрыяе паляпшэнню грамадскага іміджу АГС і **размыванне межаў паміж сектарамі** — АГС, бізнесам, палітычнымі і пратадзяржаўнымі структурамі. Калі адны і тыя ж людзі ў розных сітуацыях выступаюць як прадстаўнікі палітычных сіл, сябры пратадзяржаўных органаў у выгнанні і кіраўнікі зарэгістраваных у ЕС беларускіх АГС, гэта непазбежна стварае канфлікты інтарэсаў і зніжае давер грамадства. Да таго ж, аўдыторыя як у самой Беларусі, так і па-за яе межамі часта не адрозніваe АГС ад палітычных структур ці ад ГОНГА.

Як і раней, **празрыстасць** незалежных незарэгістраваных АГС у Беларусі заставалася амаль нулявой. Часта асцярожна афішавалі сваю дзейнасць і арганізацыі, якія легальна дзейнічаюць у краіне.

Шэраг АГС за межамі Беларусі працягвалі выпускаць штогадовыя справаздачы, у якіх апісвалася дзейнасць і яе вынікі за год, аднак рэдка ўключаліся раздзелы пра ўнутраныя інцыдэнты, выклікі, з якімі сутыкалася арганізацыя, і вывучаныя ўрокі; большасць дакументаў таксама не ўтрымлівалі інфармацыю пра фінансы або склад кіруючых органаў і каманд АГС, што **істотна зніжае празрыстасць і падсправаздачнасць сектара**. Акрамя таго, многія АГС не робяць свае справаздачы публічнымі, распаўсюджваючы іх толькі сярод партнёраў і донараў праз закрытыя каналы.

Этычныя кодэксы існавалі фрагментарна, агульных стандартаў паводзін для сектара АГС не было распрацавана. У той жа час у 2024 годзе зроблены важны крок у развіцці прафесійных этычных норм у сумежным з АГС медыйным полі: **Беларуская асацыяцыя журналістаў распрацавала праекты новага Кодэкса прафесійнай этыкі беларускіх журналістаў і канцэпцыю самарэгулявання незалежнага беларускага медыясектара**, праца над якімі была скончана ў 2025 г.